7. НГАБ у г.Гродна, ф.103, воп.1, спр.118.
8. Швед, В.В. Падзеі і постаці Гродзенскай даўніны / В.В. Швед. – Гродна, 1995. – 176 с.

## Абарона Магілёва. Чэрвень – ліпень 1941 г.

Серапян В.Р., 2 курс, гістарычны факультэт, БДПУ;
навук. кір – кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.Ф. Вялікі, БДПУ

Абарона савецкімі войскамі Магілёва 3-26 ліпеня 1941 г. - адна з самых гераічных старонак гісторыі першых месяцаў вайны на беларускай зямлі - знаходзіцца сёння ў цэнтры ўвагі айчынных ваенных гісторыкаў. На цяперашні час мала хто аспрэчвае той факт, што доўгі час вывучэнне абароны Магілёва ўскладнялася строгім ідэалагічным кантролем і падпарадкаваннем праўдзівай гісторыі інтарэсам партыйнай прапаганды.

Зазначым, што ў аснове традыцыйнай канцэпцыі абароны Магілёва ляжыць ідэя аб трох этапах абарончых баёў летам 1941 г. Першы этап доўжыўся з 3 па 9 ліпеня, калі адыходзячыя часці 13-й арміі, а таксама 61-га стралковага корпуса, які заняў абарону на дняпроўскім рубяжы, вялі на дальніх і бліжніх подступах да горада напружаныя баі з перадавымі часцямі вермахта. Асноўнымі злучэннямі, якім была пастаўлена задача абараняць дняпроўскі рубеж, з’яўляліся разведвальныя групы, з якіх складаліся асобныя ўзмацненыя батальёны. Гэтыя атрады на выгадных рубяжах у 20–25 км наперадзе асноўнай лініі абароны сустракалі праціўніка, рашучымі ўдарамі прымушалі яго разгортваюцца ў баявы парадак, тым самым замаруджвалі прасоўванне гітлераўцаў на ўсход і выйгравалі час, неабходны для стварэння абарончага рубяжа па Дняпры, а таксама канцэнтрацыі войск, якія падцягваліся з глыбокага тылу.

На другім этапе – з 9 па 16 ліпеня – упартыя абарончыя баі ішлі ўжо ў перадполлі, на асноўнай паласе абароны перад Магілёвам і на ўсходнім беразе Дняпра на абодвух флангах пазіцый 61-га стралковага корпуса. Важнейшым вынікам баёў гэтага этапа, як вынікае з мемуарнай літаратуры, было “вымотванне і перамолванне” жывой сілы ворага і яго тэхнікі.

Трэці этап доўжыўся з 16 па 27 ліпеня, калі абаронцы Магілёва апынуліся ў поўным акружэнні. Злучэнні 61-га корпуса былі акружаны ворагамі і раздзелены на часткі. 172-я стралковая дывізія і адзін полк 110-й стралковай дывізіі апынуліся адрэзанымі ад асноўных сіл корпуса. На гэтым этапе, як адзначаў камандуючы Заходнім фронтам генерал-лейтэнант А.Яроменка, з асаблівай сілай праявіліся адвага і гераізм абаронцаў дняпроўскага рубяжа, якія змагаліся з ворагам, пераўзыходзячым іх у сілах па маньшай меры ў 5 разоў. Да гэтага этапа адносяцца і спробы вырвацца з кальца акружэння [6, с. 55-62].

У адпаведнасці з планам па абароне Магілёва, непасрэдная абарона горада ўскладалася на 172-ю стралковую дывізію пад камандаваннем генерал-маёра М.Раманава з прыдадзенымі ёй часцямі і асобнымі падраздзяленнямі. На заходнім беразе Дняпра, перакрыўшы шашы Магілёў – Бабруйск і Магілёў – Мінск, у раёне вёсак Цішаўка – Буйнічы абарону ажыццяўляў 388-ы стралковы полк пад камандаваннем палкоўніка С.Куцепава з 340-м лёгкім артылерыйскім палком; у раёне вёсак Буйнічы – Зачішша – 514-ы стралковы полк пад камандаваннем падпалкоўніка С.Боніча, які падтрымліваў 493-і гаўбічны артылерыйскі полк. На ўсходнім беразе Дняпра, прыкрываючы левы фланг і тыл дывізіі, - 747-ы стралковы полк на чале з падпалкоўнікам А.Шчагловым і пры падтрымцы 601-га гаўбічнага корпуснага артылерыйскага палка. Аэрадром і мост цераз Днепр прыкрываў 341-ы асоны зеніты дывізіён [7 , с. 315-316].

З успамінаў арганізатараў і ўдзельнікаў абароны Магілёва - Ф.А. Бакуніна, А.І. Яроменкі і іншых, можна даведацца аб многіх фактах гэтай падзеі. Паводле іх ацэнак, Магілёў улетку 1941 г. быў перетвораны ў цвярдыню на Дняпры, якую гераічна абаранялі нешматлікія па колькасці дывізіі 61-га стралковага корпуса 13-й арміі. Адзначаецца, што кровапралітныя абарончыя баі вяліся з колькасна пераўзыходзячымі злучэннямі 2-й танкавай групы і 4-й арміі вермахта. Ф. Бакунін і П. Панамарэнка сцвяржалі, што "савецкія войскі ў раёне Магілёва стрымлівалі 23 дні буйныя танкавыя і механізаваныя сілы праціўніка”. А. Ярмоленка адзначае, што "магілёўскі ачаг абароны садзейнічаў затрымцы спачатку танкавых, а потым і пяхотных злучэнняў гітлераўцаў" [1, с. 52], разам з тым ён называе толькі 3 пяхотныя дывізіі. Аднак паводле ўспамінаў Маршала Савецкага Саюза Г.К. Жукава, на горад наступалі чатыры пяхотныя дывізіі і адна танкавая дывізія, полк "Вялікая Германія" і іншыя германскія часці. Паводле ацэнак Г.Жукава, у баях пад Магілёвам гітлераўцы страцілі 30 тыс. салдат і афіцэраў [2, с. 295]. Падобную лічбу пра агульныя нямецкія страты на дняпроўскім рубяжы прыводзіць і камандзір 61-га стралковага корпуса, які абараняў Магілёў, генерал-маёр Ф.А. Бакунін [1, с. 79].

У сучасны момант новыя падыходы ў асвятленні падзей звязанныя з абаронай Магілёва адлюстраваны ў манаграфіі вядомага беларускага гісторыка С.Я. Новікава. Я лічу, для таго, каб мець сапраўды дакладныя звесткі аб абароне Магілёва трэба поўнасцю выкарыстоўваць як айчынныя, так і нямецкія архіўныя крыніцы, супастаўленні, іх крытычны аналіз і навуковую верыфікацыю дакументаў. Так вось, паводле дзённікаў баявых дзеянняў чатырох нямецкіх дывізій (7-й, 15-й, 23-й і 78-й), што непасрэдна ўдзельнічалі ў штурме горада, агульная лічба іх страт склала 3.765 афіцэраў,

унтэр-афіцэраў і радавых (забітымі - 727, параненымі - 2.867 і прапаўшымі без вестак - 171), у тым ліку 176 афіцэраў (забытымі - 52, параненымі - 121, прапаўшымі без вестак - 3). Узнікаюць і іншыя пытанні, вырашэнне якіх патрабуе працягваць вывучэнне абароны Магілева на аснове ўсяго комплексу айчынных і замежных дакументальных крыніц. Хацелася б удзяліць увагу менавіта падзеям пад Магілёвам у пяты тыдзень вайны - з нядзелі 20 да суботы 26 ліпеня 1941 г. З дзённікаў баявых дзеянняў армейскага камадавання другой нямецкай арміі бачна, што абаронцы Магілёва істотна парушылі яго планы, затрымалі на дняпроўскім рубяжы нямецкія войскі, так неабходныя для разгортвання наступлення на Смаленка. Але ж менавіта 15-ая пяхотная дывізія ажыццявіла поўны захоп Магілёва і ліквідацыю супраціўленя яго абаронцаў. Такім чынам, у штурме Магілёва ўдзельнічалі 4 пяхотныя дывізіі другой палявой арміі. Адной з самых змрочных старонак бітвы за Магілёў - вызначэнне колькасці і лёсу дзясяткаў тысяч савецкіх ваеннапалонных. Асобныя спробы гісторыкаў звярнуцца да гэтай праблемы пакуль што не даюць поўнага ўяўлення пра палон у ходзе гераічнай і трагічнай абароны Магілёва, а без ведання ўсёй праўды пра трагічную долю савецкіх салдат і афіцэраў не будзе напісана рэальная гісторыя абароны Магілёва ўлетку 1941 г.

Ў пачатку 1960-х гг. нямецкі навуковец П. Карэл у сваім даследаванні ўпершыню назваў лічбу ў 12 тыс. савецкіх воінаў, якія трапілі ў палон у ходзе баёў пад Магілёвам на ўчастках наступлення 15-й і 23-й нямецкіх пяхотных дывізій. Ў данясенні камандзіра 23-й пяхотнай дывізіі [3, с.97] згадваецца агульная лічба палонных, захопленных у ходзе наступлення трох палкоў дывізіі на паўднёва-ўсходнім рубяжы абароны Магілёва, - 9 тыс. палонных. Гэтыя факты пакуль што не сталі прадметам навуковага аналізу ў працах беларускіх гісторыкаў. Адной з прычын было хутчэй за ўсё тое, што праблема палонных не ўпісваліся ў рамкі афіцыйнай канцэпцыі гераічнай абароны на Дняпры. Неабходнасць вывучэння гэтага пытання з'яўляецца асабліва відавочнай у кантэксце таго факта, што ў Магілёве ў час вайны размяшліся 8 лагераў для ваеннапалонных. Прычым толькі ў адным з іх - №313, што размяшчаўся ў Лупалаве, знаходзіліся, паводле айчынных дакументаў, больш за 40 тыс. палонных.

У выніку падлікаў, агульная лічба савецкіх вайскоўцаў, якія на працягу тыдня з 20 па 26 ліпеня 1941 г. трапілі ў нямецкі палон, складала 35.031 чалавек, у тым ліку 31 афіцэр Чырвонай Арміі. Ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі прыведзена лічба беззваротных страт, але не выдзелены палонныя: у Магілёве ў ходзе шматдзённых баёў загінулі больш за 15 тыс. воінаў Чырвонай Арміі, без уліку народных апалчэнцаў.

Аб лёсе апалчэнцаў Магілёва: ЦК КП(б)Б ўхваліў рашэнне сходу слухачоў і выкладчыкаў Магілёўскай школы НКВД-НКГБ стварыць полк народнага апалчэння. 12 ліпеня штаб народнага апалчэння прызначыў камандзірам палка начальніка школы Н.І. Кулагіна [1, с.98].

У выніку вялікай і працяглай працы ўсёй партыйнай арганізацыі ў Магілёўскай вобласці да сярэдзіны ліпеня 1941 г. было сфарміравана 14 батальёнаў народнага апалчэння, якія налічвалі ў сваіх шэрагах 12 тыс. чалавек. Пад кіраўніцтвам партыйных органаў апалчэнскага фарміравання былі створаны ў Бярэзінскім, Клічаўскім, Мсціслаўскім, Бабруйскам і іншых раёнах вобласці. 1 ліпеня 1941 года ў штабе Заходняга фронту ў раёнах Магілёва адбылася нарада партыйна-савецкага актыву з удзелам першага сакратара ЦК КП(б) П.К. Панамарэнкі, Маршалаў Савецкага Саюза Я.К. Варашылава і Б.М. Шапашнікава.У той жа час на Дняпроўскай мяжы (на ўчастку Шклоў-Магілёў-Быхаў) засяродзіліся злучэння 61-га стралковага карпусоў, які ўключаў 53-ю, 110-ю і 172-ю стрелкавыя дывізіі. Непасрэдная абарона Магілёва ўскладалася, як ужо адзначалася вышэй, на 172-ю стралковую дывізію (камандзір - генерал-маёр М.Т. Раманаў) і атрады народнага апалчэння горада.

Для абароны горада неабходна было пабудаваць абарончыя ўмацаванні. Па прызыву партыйных арганізацый у першы дзень на будаўніцтва абарончага пояса вакол Магілёва выйшла 13 тыс. чалавек. Затым іх колькасць павялічылася да 35 тысяч. У кароткі час, за 7 дзён, вакол Магілёва была створана лінія ўмацаванняў працягласцю ў 25 км, былі выкапаны супрацьтанкавы роў, акопы, траншэі. Абарончыя збудаванні ствараліся і ў горадзе і на вуліцах, перакрёстах, плошчах. На Быхаўскай вуліцы гараджане збудавалі барыкады і прыстасавалі многія жылыя дамы для баявых дзеянняў. У цэнтры горада вакол парку была створана другая лінія абароны. Гітлераўцы штодня скідалі лістоўкі і звярталіся па радыё да абаронцаў Магілёва, заклікаючы спыніць супраціў. У адказ на тое на самых высокіх будынках і гарадской ратушы былі вывешаны чырвоныя сцягі, якія палалі як сімвал непахіснасці і мужнасці. У гэтых баях, па няпоўных дадзеных, было збіта некалькі дзясяткаў самалётаў, знішчана і пашкоджана каля 500 танкаў, амаль 1500 аўтамашын, каля 700 матацыклаў, знішчана не менш за 30 тыс. і ўзята ў палон каля 2 тысяч салдат і афіцэраў праціўніка. У першых шэрагах абаронцаў Магілёва былі камуністы і камсамол. «Гераічная 23-дзённая абарона Магілёва, - пісаў Маршал Савецкага Саюза А.І. Яроменка, - паказала сабой прыклад доблесці і самаахвярнасці савецкіх воінаў і грамадзянскага насельніцтва, іх непарыўнага адзінства» [4, с. 188]. За гераізм, мужнасць праяўленае ваярамі і апалчэнцамі ў абароне дняпроўскіх рубяжоў у Магілёва, вялікая група з іх Указам Прэзідыўма Вярхоўнага Савета СССР ад 9 жніўня 1941 г. была ўзнагароджана дзяржаўнымі ордэнамі і медалямі.

Асноўнай мэтай працы было паглядзець на падзеі абароны Магілёва ў 1941 г. з боку як праціўніка, так і нашых суайчыннікаў, што ўяўляецца карысным для стварэння максімальнага поўнай і аб'ектыўнай карціны гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчынная вайны.

Літаратура

1. Солдатами были все. 2-е, дополн. и исправл. изд. Мн., 1972.
2. Жуков Г.К. Воспоминания и размышления. М., 1969,
3. Карел П. Восточный фронт. Кн. 1. Пер. А. Колина. М., 2008.
4. Солдатами были все. – С.293; Непокоренная Беларусь.
5. Еременко А.И. В начале войны. М., 1965.
6. Ерёменко А.И. Героический Могилев // Солдатами были все. 2-е, дополненное и исправленное издание. Мн., 1972.
7. Гардзееў Б.П. Магівёва абарона 1941 // Беларус у Вялікай Айчыннай выйне, 1941-1945: энцыклапедыя; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. Мн., 1990.

## Архитектурное богатство Беларуси

Силич Н.С., 10 класс, СШ №4 г. Бобруйска;
науч. рук. – учитель истории А.С. Тиханкова, СШ №4 г. Бобруйска

Вандалин Пусловский – крупный промышленник и любитель искусств. Он в 1838 году начал в Коссово строительство роскошного дворца.

Автором проекта стал выдающийся архитектор Франтишек Ящолд, а во второй половине XIX века над реконструкцией работал Владислав Маркони.

Коссовский дворец по-своему уникален. Здание состоит из центрального двухэтажного корпуса и двух боковых крыльев, а благодаря граненым зубчатым башням его часто называют миниатюрным замком.

Во дворце более 100 помещений, и ни одного проходного. Благодаря системе коридоров и особому расположению окон, на протяжении двух с половиной дней в году солнечный свет полностью заливал один из покоев. В это время хозяева праздновали День комнаты, по-особому украшая ее и проводя там много времени.

Дворец окружал прекрасный парк, где росли более 150 видов экзотических растений, а для особо редких экземпляров была устроена оранжерея. Парк живописно спускался к трем искусственным озерам и усадьбе Костюшко.

Дворец в местечке Ружаны был воздвигнут в 1602 году канцлером великим литовским Львом Сапегой. Точное время начала строительства неизвестно. Также неизвестно имя архитектора. Однако в старинных ружанских записях, датированных 1602-м годом, упоминается о крупномасштабных строительных работах, без указания места проведения застройки. Скорее всего, замок возводился на месте старой усадьбы Тышкевичей, которым имение принадлежало ранее.

В 1770-е годах дворец был фактически построен заново под руководством саксонского архитектора Я. С. Беккера в набиравшем тогда популярность стиле классицизма. Классицизм подарил миру архитектуру таких городов как Лондон, Париж, Венеция и Санкт-Петербург. Классицизм в архитектуре господствовал более трех сотен лет, в период с XVI по XIX века, а полюбился он за его гармонию, простоту, строгость .

При дворце имелись богатая библиотека, оранжерея и отдельно стоящее здание театра (1784-86 гг.). Вокруг него был разбит английский парк.

В 1784 году во дворце гостил король польский и великий князь литовский Станислав Понятовский. После третьего раздела Речи Посполитой Сапеги перешли в оппозицию царскому правительству, работы по строительству и украшению дворца были остановлены. После поражения Ноябрьского восстания 1831 года владения Сапег были изъяты в казну, а дворец сдан еврейскому заводчику под ткацкую фабрику.

Лидский замок имел оборонительное предназначение. Гедимин приказал заложить в Лиде замок, который должен был стать частью крепостных укреплений по линии Новогрудок-Крево-Медники-Троки.

Замок был сооружён из бутового камня и кирпича, имел в плане форму неправильного четырёхугольника с двумя угловыми башнями и был поставлен на насыпном песчаном холме, окруженном болотистыми берегами рек Лидея и Каменка, с севера – рвом шириной около 20 м, который соединял эти реки и отделял замок от города. Позже (вероятно, в XVI-XVII вв.) в систему предзамковых укреплений с востока было включено искусственное озеро.

На замковом дворе размещались православная церковь (в 1533 г. перенесена в город), жилые и хозяйственные постройки, с 1568 г. – суд, архив, острог. Жилые помещения размещались на верхних этажах башен.